

Жыве Беларусь!

Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№171 (684) 1 верасня 1993 г. Серада. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 500400 экз. Кошт у розніцу — 15 руб.

ФАКС

Не оскудеет рука дающего

Не жалеет средств на развитие национальной культуры коллектив Полоцкого комбината строительных материалов, которым руководит народный депутат Беларуси Владимир Тележников.

Очередной спонсорской акцией предприятия стало финансирование издания новой книги писателя-земляка Владимира Орлова "Тайны полоцкой земли". Вопреки прогнозам пессимистов вложенные деньги окупятся. Ведь только число подписчиков книги превысило цифру первоначально предполагавшегося тиража.

Степан СТАРОЖИЛ.

Ярмарка вакансий

состоится 8 сентября в Центре культуры и спорта железнодорожников столицы.

Все желающие смогут узнать о наличии на предприятиях и в организациях свободных рабочих мест, получить консультацию специалистов по трудовому законодательству и законодательству о занятости.

Анатолий ВИТКОВСКИЙ.

Так пойди же попляши

Ансамбль танца "Праменьчык" Брестского городского Дома детского и юношеского творчества побывал в Германии.

Ребята жили в семьях сверстников, отдыхали и, разумеется, давали концерты. Заработанные 3 тысячи немецких марок они не пустили на пирожные, а перечислили областной детской больнице.

Василий ВИКТОРОВИЧ.

Москва колбасам не верит

На пределе возможностей, прихватывая выходные, работают в эти дни все пять мясокомбинатов Витебской области.

После многих месяцев задержки со сдачей скота колхозы и совхозы резко увеличили его поставки.

Таков результат предупреждения о возможной "газовой атаке" Кремля, то есть отключении голубого топлива для Беларуси за неуплату долгов. Обмен продукции пищевиков на энергоносители невыгоден, ибо Россия принимает только мясные туши по 900 рублей за килограмм, а от более дорогой колбасы отказывается. За август через границу отправлено с Витебщины около 4 тысяч тонн отборного мяса, зато в своих магазинах этот продукт стал редкостью.

Сергей БУТКЕВИЧ.

Погубил буренок красный петух

Вчера ночью в деревне Русанки Копыльского района на ферме сгорело 15 коров.

По предварительным подсчетам, ущерб составил более 3 миллионов рублей.

Причина пожара — неисправность электропроводки.

Константин УЛЬЯНОВ.

Вечерний звон

У многих бестелефонных жителей Кличева скоро по вечерам все-таки будет звонить телефон.

Местный узел связи взялся оказывать новый вид услуг: с 18 часов вечера и до 8 утра, а в выходные и праздничные дни круглосуточно он будет предоставлять номера телефонов учреждений и организаций в пользование частным абонентам.

Николай ЗАПАЛЬСКИЙ.

Убегая от рэкета

Спасаясь бегством от группы рэкетиров, утонул в речке Оршица директор оршанской фирмы, бывший комсомольский работник Г.

По предварительным данным, предприниматель неоднократно подвергался шантажу с целью вымогательства денег, но к услугам милиции не прибегал, предпочитая решать свои проблемы самостоятельно...

Сергей ДВИНСКИЙ.

Вкратце

Совет Министров республики принял решение о переходе Беларуси на зимнее время — стрелки часов будут переведены на один час назад.

Это произойдет 26 сентября 1993 года в три часа.

❑

1—2 сентября состоится официальный визит делегации Республики Беларусь во главе с министром иностранных дел Петром Кравченко в Литовскую Республику.

Предусматриваются встречи с президентом, премьер-министром, министром иностранных дел Литвы.

❑

Президент Молдовы Мирча Снегур вылетел вчера в Москву для встречи с президентом России Борисом Ельциным.

В программе переговоров, среди прочего, сроки вывода 14-й российской армии с территории Молдовы.

❑

На рассмотрение правительства Азербайджана представлен проект вхождения республики в экономический союз, который объединит ряд республик бывшего СССР.

По прогнозу министра финансов Азербайджана Салеха Мамедова, если Азербайджан не войдет в экономический союз, то уровень производства в республике снизится на 30 процентов.

❑

Президент Армении Левон Тер-Петросян и командующий погранвойсками России Андрей Николаев подтвердили на встрече в понедельник в Ереване, что границу Армении будут охранять совместные российско-армянские пограничные отряды.

❑

Руководитель Грузии Эдуард Шеварднадзе заявил о провале переговоров с лидерами сторонников экс-президента Звиада Гамсахурдиа, активизирующихся на западе Грузии, и призвал к решительным действиям против них.

❑

Туркменистан, видимо, станет ассоциированным членом СНГ и будет принимать участие в работе различных органов Содружества.

Как сообщила пресс-служба президента Туркменистана, такой подход будет распространяться и на экономический союз СНГ, "если таковой будет создан на предстоящей 7 сентября встрече в Москве".

❑

Премьер-министр Украины Леонид Кучма предложил парламенту предоставить правительству полномочия для проведения чрезвычайных экономических мер.

❑

Министр обороны России Павел Грачев сегодня прибудет в Грузию.

Он намерен поставить вопрос о значительном сокращении российского военного контингента в этой стране.

❑

Линия постоянной связи между Министерством обороны Беларуси и таким же ведомством США открылась 31 августа.

❑

С успехом завершились в Испании гастроли Государственного ансамбля танца Республики Беларусь.

А уже 1 сентября артисты будут радовать своим мастерством жителей Италии.

❑

Вчера в немецком городе Прора закончила работу выставка молодых белорусских художников, организованная галереей искусств "Галтворчасць" Министерства культуры Республики Беларусь.

Сердито, но не дешево

С сегодняшнего дня белая водка дорожает в два раза.

Пол-литра "Столичной" будет стоить 1060 рублей.

Поднимается в цене и посуда — литровая банка теперь идет за 40 рублей, а трехлитровая — за 125.

Кстати, с 1 сентября вступает в действие и постановление Совмина Беларуси об упорядочении торговли водкой и другими спиртными напитками. Сейчас этот "деликатес" запрещается продавать в мелких торговых точках, диетстоловых, аэропортах, вокзальных буфетах и т.д.

Антон ЧЕКОВ.



Рисунок Олега ПОПОВА.

Милиции "ударный" батальон

Солдаты срочной службы в милицейской форме начали обживать освободившиеся казармы воинской части на окраине Витебска.

Здесь в Зеленом городке размещено новое подразделение войск МВД — батальон патрульно-постового и охранного назначения. Призывники — а их к новому году соберется 200 человек — пополнят ряды здешней милиции, которая до сих пор лишь на четверть обеспечивала потребности областного центра в круглосуточном патрулировании.

Сергей СЕРГЕЕВ.

Будьте бдительны!

Неблагоприятные в геофизическом плане дни сентября:

2 — с 14 до 15 часов, 9 — с 8 до 9, 12 — с 11 до 13, 15 — с 20 до 22, 20 — с 21 до 22, 25 — с 22 до 23.

Делать деньги помогут швейцарцы

Азербайджанская национальная валюта — манат — скоро будет печататься в республике.

Соглашение со швейцарскими фирмами "АТКА" и "ЗЕНДЕР" о покупке завода по выпуску денежных знаков будет подписано в ближайшее время.

Как заявил министр финансов республики Салех Мамедов, уже через месяц после подписания соглашения в Азербайджане будет налажен выпуск денежных знаков, а также других ценных бумаг.

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, Интерфакс, БелаПАН и РИД.

Дороги, которые нас выбирают

Кому нужны троечники?

Ирина ДЕРГАЧ, Сергей ГРИЦ (фото)

Если вы хоть иногда ездите электричками, то наверняка с ним встречались. Маленький такой, шустрый, на беспризорника из кино смахивает. Очень душевно про газету "Детектив" рассказывает. Ему улыбаются и газеты покупают чаще, чем у других.

Это Вадим. Двоечник и неисправимый бродяга. По его милости отец весь бывший Союз объездил — из каких только приемников-распределителей ни приходилось сына забирать!

С отвращением выплюнутого нормальной школой пацана год назад приняла Борисовская вечерняя. Посоветовала работу. За год парнишка, которому большинство педагогов дружно пророчили будущее бомжа, превратился в одного из самых удачливых мальчишек-газетчиков, "хорошиста" и обладателя таких карманных денег, которым может позавидовать иной сидящий на окладе учитель. Давно уже признано, что ребенок, которому хватает заработанного, редко идет воровать и попрошайничать. Ведь в глубине каждого из них хоть робко, но проклюнулось доброе и вечное, которое горстями сыпали туда родители, воспитатели, учителя...

Вот только где зарабатывать? После девятого класса базовая школа отметает троечников, по привычке считая, что устроиться на работу или попасть в училище сейчас так же просто, как пять лет назад. Но училища давно перестали зазывать к себе всех и каждого: даже в когда-то вечно не укомплектованных строительных сейчас конкурс аттестатов. В училища попрестижнее, как утверждают многие столкнувшиеся с этим мамы, направление солидных денег стоит.

В Борисове "отверженные" валом идут в вечернюю школу. Во время моей командировки здесь набирали восьмой по счету десятый класс. Многие из подавших документы успели год просидеть дома и понять, что вообще ничего не уметь и не делать — это скучно.

Ста двадцати из них школа сможет дать специальность — по инициативе директора В.П.Кушнерова здесь открываются реальные классы. Специальности для них выбраны такие, которые пригодятся и дома: столяр-плотник, мастер по ремонту телерадиоаппаратуры, портной женской одежды.

Сама идея реальных классов родилась не в Борисове, несколько минских школ уже ведут эксперименты в этом направлении. Однако местному гороно и директорам тех семи школ, которые классы открывают, понадобилась недюжинная смелость, чтобы решиться на этот шаг. Производственной базы у них никакой — даже городской УПК давно перепрофилирован. Покупать станочное оборудование, естественно, не за что. Правда, горисполком поддержал инициативу, его решение об открытии в городе реальных классов датировано еще апрелем. Но и в этом решении есть одна недосказанность: там, где речь идет о выделении школам необходимых средств, стоит пробел. У города тоже нет денег.

Не разработано Министерством образования и положение о реальных классах — это значит, у Владимира Павловича Кушнерова не было ни учебного плана, ни программ, ни учебников.

Уже сейчас и в гороно, и в решившихся на эксперимент школах хмуро подсчитывают вопросы, которые им придется решать в ближайшее время: где взять средства на ремонт? А запчасти? Как "протащить" в штат производственников?

Штатное расписание вечерней школы ориентировано на коллектив взрослых, работающих людей. Оно не предусматривает должностей завуча по воспитательной работе, психолога, замдиректора по производству. А о штатном коммерсанте, который находил бы ученикам хорошие заказы и выгодно сбывал их продукцию, речь вообще не идет. Между тем в конце прошлого года в Борисовской вечерней школе училось 420 человек.

Кое с чем в вечерней школе справились сами. Разработали учебные планы. Утрясли на месте некоторые штатные вопросы. Заключили договора с базовыми предприятиями и всеми правдами и неправдами достают списанное оборудование, покупают новые машины, буквально выпрашивают у ПТУ нужные учебники. Кое-чем уже можно гордиться: швейный цех благодаря местной швейной фабрике готов начать работу.



В этой школе учится девочка Света, у которой мама умерла, отец в лечебнице, старший брат "сидит", а младший в интернате. Саму Свету когда-то спихнули из дневной школы в интернат, да тот закрыли на перепрофилирование. Сейчас Света одна в трехкомнатной квартире, и никому, кроме разве что классной, нет дела до того, что она себе готовит, на какие деньги живет и кого приводит в гости.

Света собирается в реальный класс. Вот только не разобьется ли ее пока еще несмелое желание зарабатывать честно о не преодолимые при нынешних финансах школьные проблемы?

ОТ РЕДАКЦИИ.

Да, мы уже не "страна равных возможностей". Поэтому дороги детей "с возможностями" и без расходятся уже в школе.

Хорошо, когда обе они ведут в будущее. Но справедливо ли, что одну из них добротно мостят родительские кошельки, а второй не дает зарасти, увы, лишь энтузиазм Учителя?..

Актуальная тема

Кто поддержит альма-матер?

В Минске состоялось совещание ректоров высших учебных заведений республики, организованное Министерством образования. В нем приняли участие заместитель Председателя Совета Министров Михаил Демчук, руководители ряда министерств и ведомств.

Были рассмотрены наиболее острые и актуальные проблемы высшего образования, которые возникли в условиях тяжелого положения белорусской экономики. По мнению участников заседания, проведенный разговор был полезным и конструктивным. С целью выработки конкретных решений оно будет продолжено в соответствующих министерствах и ведомствах.

Ва ўрадзе рэспублікі

Прыватызацыя

Савет Міністраў зацвердзіў праграму прыватызацыі дзяржаўных аб'ектаў, што знаходзяцца ў рэспубліканскай уласнасці, на 1993 год. У ёй вызначаны задачы прыватызацыі, меры па яе арганізацыі, параметры і асаблівасці змянення адносін уласнасці ў галінах народнай гаспадаркі. Галоўныя мэты праграмы — павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, развіццё канкурэнтнага асяроддзя, ліквідацыя празмернай цэнтралізацыі ў кіраўніцтве эканомікай, стварэнне рыначнай інфраструктуры. Прадугледжваецца давесці да канца бягучага года па рэспубліцы долю раздзяржаўленай і прыватызаванай маёмасці ў агульным кошце асноўных фондаў, што падлягаюць змяненню форм уласнасці, да 10 працэнтаў, а таксама забяспечыць паступленне сродкаў ад прыватызацыі ў суме 1.270 мільёнаў рублёў (у цэнах на 1 студзеня 1993 г.).

У прынятай наконт гэтага пастанове Дзяржмаёмасці даручана ў месячны тэрмін апублікаваць у спецыяльным рэспубліканскім інфармацыйным бюлетэні пералік дзяржаўных аб'ектаў, прапануемых да прыватызацыі ў 1993 годзе.

Будзе выдадзена...

У сувязі з кардынальнымі пераўтварэннямі, што адбываюцца ў эканоміцы, палітыцы, культуры Беларусі, неабходнасцю сістэматызацыі даных аб гэтых сферах грамадскага жыцця, а таксама ў мэтах задавальнення патрэбнасці насельніцтва рэспублікі ва ўсебаковых ведах Савет Міністраў прыняў рашэнне аб выданні ў 1995—2000 гадах Беларускай энцыклапедыі ў васемнаццаці тамах. Плануемы тыраж кожнага тома — 40 тысяч экземпляраў.

Мы і свет

Падтрымана ўрадам і прадстаўлена на ратыфікацыю ў Вярхоўны Савет канвенцыя краін чарнаморскага рэгіёна аб супрацоўніцтве ў галінах культуры, адукацыі, навукі і інфармацыі, падпісаная ад імя Рэспублікі Беларусь у Стамбуле 6 сакавіка 1993 года.

Дапамога

Для аказання дапамогі раёнам, якія пацярпелі ад паводкі, распараджэннем урада Брэсцкаму і Гомельскаму аблвыканкамам у III квартале бягучага года выдзелена дадаткова па 2,5 тысячы тон камбікармоў.

Служба інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь — Белінфарм.

З прыёмнай "Народнай газеты" Тэл. 29-60-86

Пра міласэрнасць нічога не чулі...

Да ведама старшыні ЦК таварыства Чырвонага Крыжа рэспублікі Рамаоўскага Антона Аляксеевіча

Мінчанка Валянціна Сяргееўна Кавалёва звярнулася па тэлефоне з такім пытаннем:

— Ці не маглі б вы даць адрас арганізацыі або ўстановы Мінска, якія займаюцца зборам і адпраўленнем рэчаў насельніцтву Гомельскай і Брэсцкай абласцей, што пацярпелі ад паводкі?

— Зборам якіх рэчаў?

— Адзення, абутку і яшчэ чаго-небудзь у гэтым родзе. У мяне ёсць тое-сёе адаслаць, у суседкі — таксама. Думаю, і іншыя сем'і маглі б нечым дапамагчы. А то атрымліваецца нейкае глупства: ад іншаземцаў прымаем розныя абноскі, а самі, можа, нават лепшыя рэчы выкідваем на сметнік.

— Згодзен з вамі.

— Але вось бяда, — працягвае жаночы голас, — у каго не спытаю — паціскаюць плячыма, маўляў, не ведаем пра такое. Званю ў райвыканкам Савецкага раёна, а мне адказваюць — пра такую акцыю міласэрнасці нічога не чулі.

Учора ў дзевяць вечара па беларускім тэлебачанні выступалі прадстаўнікі нейкага райвыканкама, здаецца, Кастрычніцкага, казалі, што яны займаюцца зборам розных рэчаў ад насельніцтва Мінска.

Падзякаваўшы Валянціне Сяргееўне за інфармацыю, мы пазванілі ў Кастрычніцкі райвыканкам. Сітуацыю прасвятліў намеснік старшыні райсавета Іван Мікалаевіч Чыкілеўскі.

— Так, такое мерапрыемства мы праводзім. Праходзіць яно па лініі Чырвонага Крыжа. Звярніцеся да Вольгі Іосіфаўны Ермаковай. Яна старшыня, раскажа пра ўсё больш падрабязна.

Пасля размовы па тэлефоне з Вольгай Іосіфаўнай міжволі ўзнікла пытанне: чаму ў іншых райвыканкамах Мінска нічога не ведаюць пра такую важную справу, як грамадская дапамога людзям, пацярпеўшым ад паводкі, і што рабіць жыхарам горада, якія хацелі б аказаць такую дапамогу?

Мікалай ЦАПАЎ.

Напярэдадні

Запрашае "Будпрагрэс-93"

Больш як 80 прадпрыемстваў Беларусі, краін СНД і 20 заходнееўрапейскіх фірм прадставяць сваю прадукцыю на міжнароднай спецыялізаванай выстаўцы "Будпрагрэс-93", якая пройдзе з 7 па 11 верасня ў памяшканні выставачнага комплексу "Мінскэкспа".

На думку арганізатараў выстаўкі, прадстаўленыя на ёй экспанаты і паслугі, якія рэкламуюць фірмы, зацікавяць не толькі буйнейшыя заводы і арганізацыі будаўнічага комплексу, але і малыя прадпрыемствы, кааператывы, прыватных прадпрымальнікаў, фермераў, індывідуальных забудоўшчыкаў.

Белінфарм.

Роздум народнага пісьменніка

Каб захаваць уладу, яны здольныя аб'яднацца хоць з самім д'яблам

Васіль БЫКАЎ

Народы былога Савецкага Саюза мелі нядаўна шчаслівую магчымасць пазнаёміцца ў "Правде" з адметным сваёй незвычайнасцю матэрыялам. Маецца на ўвазе адно інтэрв'ю з выразна малітоўнаю назваю "Да возродится!", арганізаванае ўласным карэспандэнтам гэтай газеты па Беларусі. Канешне, у свой час у той газеце даводзілася чытаць і не такія матэрыялы (зрэшты, і ў пазнейшы таксама), але каб з гэткай ашаламляльнай адкрытасцю паставіцца да кволай незалежнасці краіны, дзе нарадзіўся і жывеш, дзе будуць жыць твае дзеці, — такое трэба пашукаць у наш час нават сярод самай чырвона-карычневай прэсы. Ужо наконт чаго іншага, а пра сакральную недатыкальнасць дзяржаўнасці "могучей и великой матушки-России" гэтая газеціна заўжды пісала і піша толькі з агромністым піетэтам. І тое ўвогуле зразумела, калі мець на ўвазе закаранелы шавінізм гэтага рупара маскоўскіх камуністаў. Але гэта — у адносінах да Расіі. Іншая справа "непаслухмяныя" рэспублікі "братніх" народаў, мабыць, тут ніякія самыя сакраментальныя азначэнні празмернымі не будуць. Асабліва калі іх укласці ў вусны аднаго з тых "малодшых" братоў.

Увогуле не мела б вялікага сэнсу палемізаваць з гэтым газетным ёкатам перапалоханага чалавека, які за гады ідэалагічнага ачмурэння, відаць, так і не разабраўся ў гістарычнай сутнасці часу. Калі б аўтарам таго інтэрв'ю, дадзенага ваяўнічаму прадстаўніку камуністычнай журналістыкі, не быў народны дэпутат, прадстаўнік выбарнай улады, якая ў наш час не толькі вырашае спосаб жыцця цяперашніх пакаленняў, але імкнецца вызначыць жыццё наступных, лёс нашай дзяржаўнасці. Хаця пра які лёс можна весці гаворку, калі гэты і да яго падобныя дэпутаты, ужо не таячыся, узялі курс на ліквідацыю той дзяржаўнасці, на дэнансацыю белавежскіх пагадненняў і "воссоздание единой союзной государственности". Каб жыць разам. Ствараецца ўражанне, быццам шаноўны народны дэпутат толькі ўчора апусціўся з космасу на нашу грэшную зямлю і ўбачыў, што тут "народ обнищал", што вакол жах і непарадкі, і яго напаткала шчаслівае азарэнне: "поодиночке из беды не выбраться". Быццам і не ведае, што Беларусь болей за 70 гадоў згодна і вернападдана існавала ў "едином и нормальном государстве" і менавіта ў ім дажылася да сённяшняга жаху і бязладдзя, калі "нет нефти, горючего, простаивают комбайны, перекрывается газ, нет новых российских денег". (Заўважце, усё ў безасабовай форме, усе няшчасці быццам па волі лёсу.) Што і казаць, тое сапраўды жахліва. Толькі якая тут сувязь паміж "нет нефти, горючего" і суверэннасцю краіны? Няўжо народны дэпутат думае, што ў рамках "единого и нормального" ён усё тое будзе мець бясплатна, па званку з "Белага дома"? У Расіі таксама не ўсе маюць бензін нават для жніва, бо за бензін трэба плаціць, а ў земляробаў Сібіры, напрыклад, няма грошай. Бо таксама бязладдзе, развал, сацыялістычная безгаспадарчасць. Цікава, што аўтар не разумее ці робіць выгляд, што не разумее, прычын развалу гэтай "адзінай і нармальнай" дзяржавы, якая таму і развалілася, што існаваць далей не знайшлося магчымасці. Больш таго — развал рэштак той дзяржавы і цяпер працягваецца на ўсёй яе прасторы — ад заходніх граніц да Далёкага Усходу і, мабыць, спыніць той працэс няма ніякай сілы — ні ў СНД, ні ў ВС РФ; мала дапаможа тут і дэпутацкая групоўка Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Па ўсім відаць, гэта заканамерны гістарычны працэс, бо, як сказаў расійскі паэт, "ничто не вечно под луною". Не вечныя і самыя магутныя імперыі.

Каму не вядома, што ў Віскулях было афіцыйна аформлена тое, што фактычна ўжо сталася? Гэта была спроба паратунку, каб хоць неяк авалодаць рэальнасцю, пазбегнуць шкодных ілюзій, непрадказальных ускладненняў. І толькі людзі недалёкага розуму або зламысна недасведчаныя ў палітыцы (якой, дарэчы, прафесійна займаюцца) знарок перастаўляюць месцамі прычыны і наступствы і бачаць у Віскулях пачатак цяперашняга бедства. Той пачатак не ў Віскулях, а на Дварцовай плошчы ў семнаццатым, гэта ўжо ведаюць школьнікі, і, мабыць, тое трэба нарэшце засвоіць дэпутатам. Тады не будзе гэтага настальгічна-прапагандысцкага скуголення наконт шчаслівага жыцця "в составе Союза", калі "Белоруссия создала прекрасную базу национальной культуры... "Песняров", наши научные достижения, спортивные наконец". Каму шчасліва жылося на той "прекрасной базе национальной культуры", мы надта добра ведаем, назіралі доўгія гады. Па-філасофску тое даўно і выдатна даследаваў югаслаў Джылас у сваёй паліталагічнай працы з выразнаю назвай "Новы клас", у які тады рэкрутаваліся людзі з пэўнымі здольнасцямі. Найперш вольныя ад усялякіх маральных бар'ераў, з шалёнай, безаглядна актыўнасцю, палітычна беспрынцыповыя і заўжды гатовыя служыць не разважаючы. Нямала такіх утварыла і славутае сасловье "чырвоных феадалаў", што пераважна працавалі горлам, сцелючыся перад начальствам і выбіваючы план з падданых, споеных гарэлкай сялян. Але за тое карысталіся неабмежаванымі магчымасцямі ў сваіх аграрных вотчынах, і не толькі ў іх. Цяпер выпусціць з рук уладу, прывілеі ды ранейшыя магчымасці ім дужа не хочацца. Праўда, дагэтуль, нягледзячы на суверэннасць і перабудову, яны маюць усё ранейшае. Але ім патрэбны гарант на будучае, які ў новых сацыяльных адносінах дужа ненадзейны. Глядзіш, народ раптам паразумнее, забярэ зямлю і пачне ладзіць жыццё на свой лад, як яго спрадвеку ладзілі яго продкі і ладзяць цяпер ва ўсім свеце — на аснове здаровага сэнсу і прыватнай уласнасці. Значыць, спадзяванка адна: звыклы камуністычны рэжым, дзе так салодка жылося вялізнай зграі партыйна-гаспадарчых захрыбетнікаў. І цяпер, спахапіўшыся, яны пачалі адмаўляць у суверэннасці краіне, у якой звыкла ўладараць.

Так, цяпер кепска — і збядненне, і разлад, якія яны спрабуюць спісаць на дэмакратаў, на славуты разрыў сувязей, на ізаляцыянізм як палітыку нацыяналістаў. Але ўсё тое — чыста бальшавіцкая прапаганда, замешаная на гебельсаўскіх рэцэптах: чым болей неверагодная хлусня, тым ахвотней у яе паверацы. Дзе ў Беларусі тыя дэмакраты, пры якой служаць уладзе? Жменька дэпутатаў БНФ у Вярхоўным Савеце — усяго каля 16 працэнтаў ад агульнай колькасці дэпутатаў. Астатнія — камуністы ў сталіцы і раёнах. Дэмакраты маглі б прыйсці да ўлады, калі б былі праведзены дэмакратычныя выбары, калі б камуністычны Вярхоўны Савет не скасаваў рэферэндум. Ворагі суверэннасці не перастаюць крычаць аб разрыве эканамічных сувязей як галоўнай прычыне эканамічнага развалу. Але хто рве сувязі? Хіба ў дакументах Віскулёў напісана нешта падобнае? Хто і дзе прагалошваў аб неабходнасці разрыву эканамічнага саюзу з Расіяй ці з якой-небудзь іншай дзяржавай былога Саюза? Пра тое, што аўтаркія — не наша палітыка, дэкляравалі, бадай, усе дэмакратычныя партыі Беларусі, якія, не перастаючы, патрабуюць усталявання разумных эканамічных сувязей з Расіяй і з усім светам, дзе гэта толькі магчыма. Але чаму не наладжваюцца, а рвуцца тыя сувязі — няблага запытацца ў вярхоўнай улады рэспублікі, дзе сышліся ўсе правады кіравання. Ці няма тут таемнага, недзе тонка распрацаванага сабатажу супраць яшчэ слабага суверэнітэту рэспублікі? Дужа ўжо ён не даспадобы пэўным сілам у Беларусі, якія мараць вярнуцца туды, дзе ім было так зручна і сытна, — у звыклую сістэму планава-каманднай эканомікі з яе непераможным флагманам ВПК, які нарэшце і развалі тую савецкую эканоміку. Эканоміка, у якой 80 працэнтаў нацыянальнага прыбытку пачала адбіраць вайсковая вытворчасць, доўга існаваць не магла. Тое зразумела не толькі ЦРУ, але і КДБ, а за імі і малады "гаспадар СССР" Міхаіл Гарбачоў, які пачаў перабудову, каб выжыць, уратаваць дзяржаву і КПСС. Ды было ўжо позна — не магла і перабудова.

Набыўшыся ў вялікай "дружнай сям'і" народаў пад кіраўніцтвам "мудрай партыі", што пасварыла СССР з усім светам, падвяла яго да глабальнай ядзернай катастрофы, народы памкнуліся кожны на свой хутар, бо зразумелі, што ўратавацца можна толькі паасобку. Каб не быць заложнікамі чужой вар'яцкай палітыкі, ачмурэлай ідэалогіі, непад'ёмнай, дашчэнту змілітарызаванай эканомікі, а кіравацца адным — уласным меркаваннем здаровага сэнсу, сваёй нацыянальнай ментальнасцю. Уратаваць кожную нацыю здолеюць толькі яе ўласныя намаганні, уласная нацыянальная палітыка, эканоміка па ўласных сродках-магчымасцях. Цяжка? Так, іначай і не магло быць: пераход ад аднаго сацыяльна-палітычнага ладу да зусім іншага, мабыць, безканфліктна не адбываецца. Хаця, канешне, шмат што зроблена няўмела, многае не зроблена зусім, іншае зрабіць не далі абставіны ці чужыя варожыя сілы. Але суверэнітэт дае надзею — калі не нам, дык хоць нашым дзецям. Суверэнітэт, як і дзяржаўнасць, дамагаліся дзесяткі пакаленняў лепшых людзей нашай няшчаснай нацыі, усе іх высілкі звычайна тапіліся ў крыві. А тут ён упаў, гэты суверэнітэт, нібы райскі саспелы яблык, толькі падніміце яго, карыстайцеся, добрыя людзі. [illegible]

[illegible] ...ных на другіх. Класавы прынцып ужо не спрацоўвае, дык трэба іншы. Ужо выкарысталі "польскую карту", "летувіскую" таксама (згадваюцца прэтэнзіі старога Вярхоўнага Савета на Віленскі край). Здаецца, ужо бяздарна адпрацаваны і "карта Палісся", і Славянскі сабор, дык, мабыць, надышоў час выкінуць апошні козыр. "Более полутора миллионов русских (так у тэксце. Відаць, праўдзінскія грамацеі адносяць лічэбнік "паўтара" да множнага ліку. — **В.Б.**) попали, быть может, еще в большую беду, чем белорусы. Они не могут выехать даже на похороны своих родных", — пралівае слязу паважаны народны дэпутат, узрушаны такімі варварскімі адносінамі да рускіх на Беларусі. Во што нарабілі гэтыя беларускія нацыяналісты — не дазваляюць хаваць нябожчыкаў. Жах ды і толькі! Ці не пара таму ўводзіць узброеныя сілы Расіі, каб абараніць грамадзянскія правы рускага насельніцтва Беларусі?

Але нашто ўводзіць?

Гэта ў свой час "спатрэбілася" ўводзіць Савецкую Армію ў Прыбалтыку, Малдову, Венгрыю і Чэхаславакію, у Афганістан нарэшце. Беларусь жа ў гэтым сэнсе дае вялікія перавагі ды эканомію рэсурсаў і сродкаў, загадзя трымаючы тут сотні тысяч чужога войска, якое даўно і беспакарана гаспадарыць ад Брэста да плошчы Незалежнасці ў сталіцы. У Беларусі таксама актыўна дзейнічае нядаўна рэанімаваная партыя камуністаў, людзі якой засядаюць, не таячыся, ва ўсіх без выключэння органах заканадаўчай, выканаўчай, судовай улады. Эканоміка гэтай краіны даўно і надзейна з'яднана з расійскім ВПК і прылучана да агульнага нафтава-энергетычнага трубапровода, закрутка ад якога знаходзіцца ў Маскве. Беларускія грошы, знарок зняважліва названыя "зайчыкамі", у два разы таннейшыя за расійскія рублі, і калі іх цяжка памяняць на расійскія, дык нядоўга патрабаваць ад дырэктара Нацыянальнага банка арганізаваць гэты абмен і ўстанавіць новы, льготны для таго курс. А можа, стварэнне такіх і падобных "канфліктных зон" у нейчых уладных інтарэсах? Таксама як і сабатаж вытворчых ды іншых сувязей з краінамі бліжняга і далёкага замежжа, як развал забеспячэння Беларусі энерганосьбітамі (крызіс якіх даўно ўжо пераадолены, напрыклад, у нашых суседзяў — Польшчы і Летуве). Як і сабатаж заканадаўчай абароны дзяржавы і грамадзян ад карупцыі і арганізаванай злачыннасці; задоўжаная адсутнасць разумнага заканадаўчага стымулявання замежных інвестыцый у нашу эканоміку; паліятыўны закон аб землекарыстанні. Ці ўсё тое Вярхоўны Савет ды ўрад не могуць вырашыць у рамках суверэннай дзяржавы, патрэбны звыклыя ўказанні з Масквы, куды і накіравалася спецыяльная дэлегацыя? Маўляў, прыміце ў вашу дзяржаву, адны мы гаспадарыць не можам. "Надо немедленно создавать единое государство даже из двух наших республик. Поймите, для других народов бывшего СССР это будет мощным стимулом".

Хочацца запытаць: стымулам чаго?

Ці не стане такая ініцыятыва стымулам для сапраўднай вайны ўсіх з усімі, бо далёка не ўсе думаюць так, як праўдзінскія аўтары, і зусім не прагнуць вярнуцца назад, у стойла, у казарму? Калі нават у казарме не трэба думаць, як "накормить народ". Ці не прынясуць некаторыя з ускраінных "гарачых кропак" разам з азначаным стымулам і гарачыя вугалькі пажару? Да зубоў узброеныя расійскай ды іншай зброяй, ці не запатрабуюць яны столькі хлеба і нафты для сваіх рэгіянальных войнаў, колькі новыя гаспадары не здолеюць ім даць? Што тады будзе? Шмат гэтых "ці" ўзнікае пры чытанні падобных пасажаў, але, вядома, шаноўны дэпутат на іх не дае адказу. Апантаны ідэяй стварэння "единого государства", здаецца, пра іх і не думае.

Суверэннасць нацыі і дзяржавы — адна з самых свяшчэнных даброт супольнага чалавечага існавання, і толькі ва ўмовах скажонай, перакуленай свядомасці з'яўляецца патрэба тое даказваць. Толькі знешні вораг ці ўнутраны здраднік можа ў наш час выступаць супраць права народа на самавызначэнне, на самастойнасць яго існавання. У Расіі адносіны да суверэнізацыі таксама розныя. У той час як імперскія сілы гатовы сёння ж вярнуць усіх з ненавіснага ім "парада суверэнізацыі", лепшыя расійцы, сапраўдныя дэмакраты ўсяляк падтрымліваюць памкненні народаў да волі, да выхаду з-пад шматгадовага камуністычнага прыгнёту. Вось да іх бы і паехаць дэпутатам, наладзіць саюз і палітычныя сувязі. Дык не, ім мілей рэакцыйны Вярхоўны Савет.

Нацыянальная незалежнасць, дзяржаўная суверэннасць нацый і народаў сталі адметнай вяхой гісторыі напрыканцы XX стагоддзя. Іншая справа, як распарадзіцца той суверэннасцю, як на яе аснове наладзіць эканоміку, урэгуляваць прававое жыццё. Вядома, у нас яны ладзяцца з рук вон кепска. І тут галоўная прычына ў кіраўніцтве, ва ўладзе. Стала відавочна, што са зменай сацыяльных адносін патрэбна і змена ўлады. Старая камуністычная ўлада не здольная пабудаваць новыя, рыначныя адносіны: па-першае, не ўмее, па-другое, не хоча — гэта ўжо зразумела кожнаму. Былыя спецыялісты-гаспадарнікі, выхаванцы партыйных акадэмій, ВПШ, розных заідэалагізаваных ВНУ, спрактыкаваныя арганізатары сацыялістычнага спаборніцтва, якое яны дзесяцігоддзямі шырылі і шырылі, аказаліся бездапаможнымі ў новых эканамічных абставінах. Але яны ўчэпіста трымаюцца за старое і лепей пусцяць на распыл усю эканоміку, чым "пярэйдуць у новую веру". Як тыя генералы ВПК, што праявілі незвычайную ў сваёй упартасці цвёрдасць — за восем гадоў размоў аб канверсіі, здаецца, так і не выпусцілі ніводнай каструлі. Толькі танкі і ракеты, ракеты і танкі, ад якіх цяпер немаведама як пазбавіцца. Гэтак жа і "чырвоныя феадалы", сельскагаспадарчыя "князькі" ўсіх гатункаў: яны ўжо не ўступяць калгаснай зямлі, бо для іх калгаснае — даўно стала сваім. А па-другое, яны эмпірычна спасціглі неабвержную для кожнага ладу ісціну: у каго зямля, у таго і ўлада.

А ўжо з уладай яны не расстануцца, нават каб для яе ўтрымання спатрэбілася заключыць "калектыўнае пагадненне" або аб'яднацца хоць з самім д'яблам.

❑

Репортер узнал

Сорок дней радости

Именно столько длились гастроли брестского фольклорного ансамбля "Радость" по атлантическому побережью Франции.

Попутно ансамбль поучаствовал в международном фольклорном фестивале, получил горячий зрительский прием и несколько лестных предложений, согласно одному из которых артисты уже пакуют чемоданы в месячное турне в Турцию.

Василий ПРОВОДОВ.

Позарился...

В деревне Долгая Дуброва Житковичского района нигде не работающий житель соседнего села взломал дверь в доме одинокой пенсионерки, избил ее и забрал 2500 рублей.

Андрей АРШАНСКИЙ.

Не зря ислам вино ругает...

Братоубийственные конфликты между афганцами вспыхивают не только на их родине.

Ночью в общежитии Пинского индустриально-педагогического техникума в разгар распития бутылки обучающийся здесь гражданин Афганистана ударил ножом в грудь и живот неработающего гражданина этой же страны. При доставке в больницу последний скончался.

Василий ВИКТОРОВИЧ.

Ваш паспорт, гражданин!

Гомельский горсовет вслед за минским и брестским принял решение об обязательной регистрации в течение суток всех прибывающих в город независимо от того, по служебным или по частным делам они прибыли.

Эта мера введена в связи со значительным ростом количества преступлений в городе, совершаемых бывшими "союзными" соседями.

Вадим ТЕЛЕГИН.

Вопрос ребром

Будут досрочные выборы?

Гражданский комитет за досрочные выборы Верховного Совета и Советов всех уровней решено создать по инициативе Объединенной демократической партии Беларуси и Белорусского народного фронта.

Официальное заявление об этом было сделано в Ивацевичах на встрече демократической общественности города с руководством ОДПБ.

На встрече обсуждалась политическая ситуация в государстве. Ее участники высказались против попыток ликвидации независимости Беларуси, за необходимость демократических преобразований и экономических реформ.

Белинформ.

Операция "Таблетка"

Нужны пилюли? Иди на рынок

Василий САРЫЧЕВ, собственный корреспондент "Народной газеты" по Брестской области

Не первый месяц Брестский рынок плотно оккупирован украинцами. Соседи с Волыни вывозят в рублевую зону все грузоподъемное и пользующееся спросом. Брестчане охотно берут.

Выполняя задание редакции, автор целенаправленно осматривал прилавки рынка на предмет пузырьков и пилюль. Медпрепараты имелись примерно у каждого четвертого-пятого продающего. Кто-то опасливо прикрывал товар газеткой, другие торговали лекарствами в открытую. Периодически возникавших женщин с повязками интересовала не более чем оплата торгового места; милиция грозно лузгала семечки, думая о своем.

Между прочим, торговля лекарственными средствами частным лицам (ровно как и не имеющим лицензии Минздрава организациям) запрещена прошлогодним решением Брестского горисполкома. Но жизнь любит вносить в желаемое коррективы.

О ценах на лекарства. По сравнению с аптеками на рынке они выше в среднем в два раза. Украинские бизнес-туристы просят меньше. Упаковку викалина можно купить с рук за 180 рублей, нафтизин — за 150, санорин — 230, корвалол — 60—100 рублей, клофелин — 200...

Было бы это неплохим подспорьем людям и местной фармации, если бы не некоторые "но". Неизвестно, сколько времени и в каких условиях эти лекарства у диких торговцев хранились. При несоблюдении этого снадобье в лучшем случае теряет целебные свойства.

Областное производственное объединение "Фармация" финансируется Минздравом Республики Беларусь, понятно, не из расчета на лекарственное изобилие. Чем-то помогает облисполком, оказавший, в частности, 80-миллионную финансовую помощь на закупку медикаментов, контракт на 15 тысяч долларов с поляками и на 10 тысяч долларов с польской фармацевтической фирмой заключен на его выделения. Но для удовлетворения спроса этого далеко не достаточно, что генеральный директор ОПО "Фармация" Валентина Сосонкина прекрасно понимает. Нужны какие-то нестандартные ходы. Так, предпринималась попытка использовать приграничное положение Бреста.

Бум на вывоз в Польшу лекарственных средств с год как прошел, едут туда сегодня через Брест в основном белорусы, и от былых изъятий целых коробов с медикаментами у таможни остались воспоминания.

Приятным для брестских фармацевтов исключением стала недавняя передача им таможенной службой партии порошка витамина С, конфискованного у белгородских коммерсантов. Наладить же качественный анализ единичных упаковок пусть и дефицитных лекарств не представляется возможным, и в торговую сеть последние с таможни не возвращаются.

Существенное влияние на лекарственное обеспечение области оказывает гуманитарная помощь. После скандальной весенней проверки областного комитета Красного Креста поступление гуманитарных медикаментов независимо от адресатов разрешено только на областной аптечный склад, где лекарства подвергаются анализу. Последний они, правда, по причине истечения срока годности не всегда выдерживают и здесь же, на складе, уничтожаются.

Самые веселые ребята, участвующие в "решении" лекарственной проблемы, — по традиции частные коммерсанты. В подавляющем большинстве они охочи на крупные сделки, желательно с плеча и без качественного анализа. При упоминании о последнем они тихо исчезают вместе с предложениями и, наверное, правильно делают. Последней, совсем свежей жертвой лаборатории качества стали дамские тампоны молдавского производства, напоминающие под микроскопом дискотеку микробов всех возрастов.

Областное ПО "Фармация" напрямую работает с сотней предприятий — производителей ближнего зарубежья, то и дело сталкиваясь с непроходимыми дебрями межбанковских расчетов. С некоторых пор в фармации стали цениться крепкие мужчины, не опасающиеся командировок и объемных чемоданов.

По мнению экспертов и специалистов, на сегодняшний день единственный надежный способ относительного насыщения отечественного рынка — наращивание производственных мощностей и освоение новых технологий белорусскими фармацевтическими предприятиями.

Знойные нормы

Пейте воду, господа?

Вокруг питьевой воды в Минске продолжают разгораться страсти.

Чтобы расставить все точки над "і", как мы и обещали в публикации "В мутной водице утки плавают" ("Народная газета" за 15 июля с.г.), предоставляем слово специалистам.

Вице-президент Международной академии экологии, профессор А.В.КУДЕЛЬСКИЙ:

— Качество воды в Минске не соответствует современным требованиям.

Так, в 7 скважинах на берегах Дроздовского водохранилища обнаружены коммунальные загрязнения. Ухудшилось качество подземных вод водозаборов "Зеленовка", что в Уручье, "Новинковское" по хлору и другим компонентам. Наличие нитратов отмечено в воде водозаборов "Водопой" и "Островы".

ПО "Минскводоканал" для нейтрализации патогенных бактерий применяет хлорирование питьевых вод. Однако для цивилизованных стран этот метод недопустим. В результате реакции с органическими соединениями воды образуется целый ряд канцерогенных веществ. Для очистки же воды от растворенных в ней органо-хлористых соединений (пестициды, гербициды и др.) и тяжелых металлов (ртуть, кадмий, хром и др.) следует использовать высокоактивные сорбенты (активированный уголь). И хотя это дорого, другого пути ведь нет. Администрации нашего города решать данный вопрос рано или поздно придется.

Главный инженер ПО "Минскводоканал" Н.И.КРУК:

— Сегодняшние волнения минчан по поводу недоброкачественной воды, я считаю, излишни. Заявляю с полной ответственностью, что вода в столице соответствует показателям, определенным ГОСТом.

У нас 11 водозаборов артезианских и один — из открытого источника. Естественно, вкусовые качества воды из Вилейско-Минской водной системы (ею пользуются жители Фрунзенского, частично Октябрьского, около трех четвертей Московского районов) оставляют желать лучшего, но, повторюсь, нашим нормам полностью соответствуют.

У нас серьезный тройной контроль: ежедневный анализ делает наша лаборатория, которая аттестована и несет полную ответственность, проверяет нас горсанэпидемстанция и ежеквартально — специалисты Госстандарта. Никаких нарушений качества воды по водозаборам этими организациями не отмечено. Другой вопрос — о самом ГОСТе, который надо ужесточать, ведь некоторые его нормы устарели. Отсутствуют, например, нормы радиоактивности, количества продуктов хлорирования. Сегодня много новых требований к питьевой воде.

❑

К комментариям специалистов добавим, что в последнее время и в редакции все чаще раздаются тревожные звонки по поводу качества воды в некоторых столичных районах. И хотя, как уверяют в ПО "Минскводоканал", нарушений норм ГОСТа нигде не обнаружено, о чем писала газета, однако проблема все-таки не столь чиста, как слеза младенца.

В республиканском управлении стандартизации нам сообщили, что до принятия нового стандарта по питьевой воде еще очень далеко. Сложности с финансированием.

Так что пока у нас все в норме?

Беларусь — Израиль

За знаниями — в Тель-Авив

Большая группа работников коммерческого банка "Беларусь" вылетела вчера в Израиль. Белорусские финансисты планируют основательно изучить тонкости организации банковского дела в этом ближневосточном государстве.

Командировка на учебу в Тель-Авив организована белорусским представительством израильской организации "Гешер-Алия". Она занимается налаживанием деловых связей в области экономики, политики и культуры между странами СНГ и Израилем.

В перспективе "Гешер-Алия" планирует учебу в Израиле работников страховых компаний и медицинских учреждений.

Белинформ.

Знайте наших!

Франция опять покорена. Талантом и одухотворенностью

